ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
24
ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 7 (1383)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

## НА ПАСЯДЖЭННІ...

бюро камітэта камсамола універсітэта было разгледжана пытанне аб рабоце камітэтаў камсамола факультэтаў з выпускнікамі і слухачамі ФГП. У прынятай пастанове адзначаецца станоўчая работа ў гэтым напрамку механіка-матэматычнага, філалагічнага факультэтаў, факультэта радыёфізікі і электронікі. Дрэнна выкарыстоўваюцца выпускнікі і слухачы ФГП у грамадскай рабоце на гістарычным, хімічным, біялагічным, геаграфічным факультэтах.

Камітэтам камсамола факультэтаў прапанавана стварыць штаб па рабоце з выпускнікамі факультэта грамадскіх прафесій, а таксама з маладымі спецыялістамі, укараніць у практыку разгляд на пасяджэннях камсамольскіх бюро груп і курсаў справаздач слухачоў ФГП аб выкананні імі камсамольскіх даручэнняў.

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.

## ДАКРАНУЦЦА ДА ПОДЗВІГУ

кожнаму з нас дапамог месячнік абаронна-масавай работы, які прайшоў ва універсітэце. За гэты час праведзены шматлікія спаборніцтвы па кулявой стральбе і радыёспорту, аднаўлена наглядная агітацыя на факультэтах.

Але найбольш цікавымі былі сустрэчы студэнтаў з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны — выкладчыкамі універсітэта А. С. Мізрахі, Б. А. Сяргуніным, І. Ц. Пракапенкам, П. Т. Кавалёвым, якія расказалі аб прыкладах гераізму байцоў.

**М. ГАРЛАТАЎ,**
старшыня камітэта ДТСААФ.

## НА ЛЫЖНЫЯ ТРАСЫ

выйшлі супрацоўнікі універсітэта. Больш за 70 чалавек удзельнічала ў першынстве па лыжнаму спорту ў праграме спартакіяды «Здароўе». Лепшых рэзультатаў дабілася каманда Вылічальнага цэнтра, якая і заняла першае месца.

Па выніках гэтых спаборніцтваў была састаўлена зборная каманда супрацоўнікаў універсітэта для ўдзелу ў першынстве аблсавета СДСТ «Буравеснік».

**М. КУЧЫНСКІ,**
старшыня спартыўна-масавай камісіі прафкома.




## 65-я ГАДАВІНА САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ

# ПРАЎДА ГІСТОРЫІ

**Не мной заўважана: характар чалавека — у яго ўчынках. Кірыл Конанавіч Герман пражыў жыццё імклівае і сціплае. Узнагародамі не хваліўся, за пасадамі не гнаўся — проста рабіў сваю справу належным чынам. Ці то на вайне, ці ў дні мірнай, стваральнай працы.**

Працалюбства тое ды грунтоўнасць — ад сялянскага кораня. Памятае Кірыл Конанавіч, як пасля ўрокаў бег на луг — пасвіць кароў. Пугай зарабляў на хлеб, бацькам дапамагаў. Дзякуй Савецкай уладзе: гэта яна падняла на ногі, дала адукацыю. І вось ужо ў 1931 годзе, пасля заканчэння сямігодкі і двухгадовых педагагічных курсаў, едзе юнак у Рагачоўскі раён — настаўнікам гісторыі.

Раз і назаўжды выбраў К. К. Герман нялёгкую настаўніцкую дарогу. Пралягла яна па Магілёўшчыне і Гомельшчыне, па Случчыне (дарэчы, у Слуцкі раён прыехаў малады настаўнік па накіраванню камсамола — была такая неабходнасць). Яна ж прывяла Кірыла Конанавіча на гістарычны факультэт універсітэта. Было гэта сорак восем гадоў назад.

Пара студэнцтва... Кірыл Конанавіч успамінае бурныя камсамольскія сходы, дыспуты, спрэчкі да хрыпаты. Не дзялілі справы на галоўныя і другарадныя — змагаліся з непісьменнасцю, з парушэннямі дысцыпліны, фармалізмам.

— Гарачы быў час,— гаворыць.— Самі вучыліся, іншых вучылі. Марылі, што будзем жыць багата і шчасліва. Ды вайна парушыла ўсе планы, па-свойму распарадзілася.

...Гэта было на Курскай дузе. Варожыя танкі шалёна паўзлі на пазіцыі, якія абаранялі артылерысты процітанкавай батарэі. Выбухі, агонь, дым, смерць... Выстаялі «саракапятчыкі», не адступілі. Вось загарэлася адно страшыдла з павукомкрыжам на баку, чорным дымам зайшоўся другі танк. І калі да акопаў заставаліся лічаныя метры, фашысты не вытрымалі, павярнулі назад.

— Што, прайшлі?—крыкнуў наўздагон танкам палітрук Герман і ў знямозе апусціўся на лафет гарматы. І толькі тады заўважыў на гімнасцёрцы крывавую пляму — варожы асколак не мінуў салдата...

Пасля Курскай дугі былі Днепр, баі за Украіну, Польшчу. Там, на Сандамірскім плацдарме, пасля жорсткага бою сустрэўся К. К. Герман з былым сваім вучнем Іванам Караленкам. Тады ж і сфатаграфаваліся на памяць: абодва салдаты, абаронцы Радзімы.

— Мы і цяпер часта сустракаемся, — гаворыць Кірыл Конанавіч. — Іван Кузьміч працуе ва універсітэце, на кафедры палітычнай эканоміі. Кандыдат навук, дацэнт.

...Дзень Перамогі сустрэў капітан К. К. Герман у Празе. За баявыя подзвігі Радзіма ўзнагародзіла яго двума ордэнамі Айчыннай вайны ІІ ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, шматлікімі медалямі. Апошнюю баявую ўзнагароду — ордэн Айчыннай вайны І ступені—атрымаў за вызваленне сталіцы Чэхаславакіі.

Адгрымела вайна, і самы час быў вярнуцца ў школу ці універсітэт — гісторыю выкладаць. Ды абставіны іншы раз бываюць мацней за нас: камандаванне пакідае К. К. Германа ў дзеючай арміі. Праўда, і тут Кірыл Конанавіч не без любімай справы—некаторы час працуе начальнікам вячэрняга універсітэта марксізму-ленінізму, чытае курс гісторыі КПСС для афіцэраў Беларускай ваеннай акругі. Затым — дэмабілізацыя. І вось ужо 21 год працуе К. К. Герман ва універсітэце. І ні разу не засумняваўся ў правільнасці свайго выбару, і ў ім, трэба адзначыць, таксама не сумняваліся.

У сорак дзевяць гадоў прыйшоў К. К. Герман у БДУ імя У. І. Леніна. Іншыя ў гэтым узросце ўжо ў дактарах навук ходзяць, вучняў і паплечнікаў маюць, а ён... Ды яшчэ ніколі не падводзіла былога салдата ўменне працаваць, мэтанакіраванасць і настойлівасць. У вучобе тым больш. Праз некаторы час атрымлівае Кірыл Конанавіч вучоную ступень кандыдата навук, а ў 1972 годзе абараняе доктарскую дысертацыю. Сёння можна назваць шэраг кніг і манаграфій, на тытульным лісце якіх стаіць прозвішча К. К. Германа, ён з'яўляецца таксама адным з аўтараў шырокавядомага дапаможніка «Курс лекцый па гісторыі КПСС».

...Кожны год 9 мая прыходзіць К. К. Герман на плошчу Перамогі. Часта — разам з сынамі. Іх у Кірыла Конанавіча двое. Моўчкі стаяць яны — бацька і сыны — ля Вечнага агню. Аб чым думае салдат? Можа, бачыць твары баявых сяброў, што не вярнуліся з далёкіх паходаў? І аб чым бы ні задумваўся Кірыл Конанавіч, няхай будзе ўпэўнены: у яго надзейная змена.

**А. ФАМІЧОЎ.**

КАМІТЭТ па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў БССР, сакратарыят Беларускага рэспубліканскага савета прафесіянальных саюзаў, Дзяржкамітэт Савета Міністраў БССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню, сакратарыят ЦК ЛКСМ Беларусі, праўленне Саюза журналістаў БССР падвялі вынікі рэспубліканскага конкурсу «Спартыўнае пяро-82» на лепшую прапаганду ў друку, па тэлебачанню і радыё масавай фізічнай культуры і спорту, прысвечанага 60-годдзю ўтварэння СССР.

За актыўную работу па прапагандзе і асвятленню пытанняў развіцця фізічнай культуры і спорту **газета «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» узнагароджана Ганаровай граматай Беларускага рэспубліканскага савета прафесіянальных саюзаў.**

# ТВАЯ АКТЫЎНАЯ ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ

## ПРАЦЯГВАЕМ ДЫСКУСІЮ:

...У рэдакцыю прыйшло пісьмо. З'ява звычайная. Але бываюць пісьмы, якія называюць «сярдзітымі» ці «калючымі». Тое, што даслаў студэнт Н. К., іменна з гэтай серыі. Ён абвінавачвае ўвесь свет у тым, што яго супраць волі спрабуюць зрабіць актывістам, пазбаўляюць права выбару сваёй жыццёвай пазіцыі. Адначасова Н. К. скардзіўся на няшчырасць камсамольскіх важакоў, іх захапленне «паперкамі», пісаў пра нуду ў студэнцкім жыцці, крытыкаваў нецікавыя мерапрыемствы і прапанаваў пакончыць з выхаваннем дарослых, як ён лічыць, людзей і пакінуць за ВНУ толькі адукацыйныя задачы. «Навошта мне гэта патрэбна?» — вось асноўнае пытанне, якое задае ўсім Н. К.

Сёння газета друкуе водгукі на яго пісьмо. «Каму што патрэбна?» Такім загалоўкам можна аб'яднаць адказы, якія мы атрымалі. Яны сталі своеасаблівым працягам дыскусіі «Актыўная жыццёвая пазіцыя студэнта. У чым яна праяўляецца?»



## «А што зрабіў ты?»

Н. К., КАБ РАССТАВІЦЬ усе кропкі над «і», скажу адразу: «Я з тых, хто свядома (а яшчэ падкрэслю — з гордасцю) адносіць сябе да актыву. Свядома.

Табе быць актывістам не цікава і не зручна, пішаш ты, а мне здалося, што ты замест «актывістам» хацеў напісаць «камсамольцам». Я не спрабую лавіць цябе на словах, але камсамолец і актывіст — паняцці тоесныя. Няўжо ты такі наіўны і на самай справе лічыш, што камсамолу патрэбны толькі твае ўзносы? Падачкі камсамолу не патрэбны. Ты яшчэ не адчуў сваю неабходнасць камсамолу? Як жа ты яе збіраешся адчуць, калі ў сценах універсітэта цябе ніхто і нішто не цікавіць? А ці ўзяўся ты хоць за адну справу? Хоць адну праблему ты вырашыў? Ці спрабаваў змагацца з нудой і фармалізмам у студэнцкім жыцці? Ці ўнёс ажыўленне ў жыццё групы, хаця б у адзін камсамольскі сход, на якім ты не проста сядзеў? Хаця б аднаго двоечніка ты прымусіў вучыцца? (Ты ж спрабуеш пакінуць за ВНУ толькі адукацыйныя задачы). Твой адказ ведаю: «Усё гэта я ўжо чуў шмат разоў». Зразумела, чуў. А што зрабіў? Жахлівей тваіх слоў: «Толькі б мяне не чапалі і не прымушалі рабіць тое, чаму я не веру»— нічога не прыдумаеш. Табе няма ніякай справы, што ў тваёй групе палова троечнікаў, а ёсць і двоечнікі, якія заўтра будуць дрэнна кіраваць вытворчасцю, няўмела вучыць тваіх дзяцей, пісаць нізкаякасныя кнігі... Ты не прывык жыць для другіх. А без гэтага ты ніколі не адчуеш сваёй неабходнасці не толькі камсамолу, але і людзям наогул. Ведаю, ёсць у цябе сябры, якім ты патрэбен. Наўрад ці называеце вы сябе «сераднячкамі», «шэрымі асобамі», хутчэй за ўсё гэтыя эпітэты вы пакідаеце для нас, актывістаў. Думайце што хочаце, а мы будзем чытаць Астроўскага і змагацца з пасіўнасцю, слухаць музыку і дзяліць радасць ад яе з іншымі, вучыцца і вучыць адстаючых. Мы будзем спрачацца на сходах, таму што не жадаем, каб было ў жыцці зло, таму што імкнемся да шчасця, і не толькі для сябе.

Будучыня — за людзьмі актыўнымі, за тымі, хто разумее, што іх веды патрэбны не толькі асабіста ім. Не спадзявайся, Н. К., што доўга працягнецца тваё «шчасце». Барацьба з вамі ўжо ідзе. Не думай, што павялічваецца колькасць табе падобных і знікаюць «звышактывізаваныя» прадстаўнікі студэнцтва. Нас — больш. І не кар'еры мы шукаем, а працуем дзеля таго, каб пазбавіцца ад мяшчанства і абыякавасці. У нас ёсць перавагі перад вамі — мы не палохаемся «чорнай» работы, мы верым у людзей. Нашы веды патрэбны нам не для «свецкіх» размоў, а каб ператварыць іх у справы.

Што ты цяпер скажаш, Н. К.?

**А. ГУЛЕВІЧ,**
**загадчыца сектара ўліку камітэта камсамола.**

## «Звяртаюся да камсамольскіх важакоў»

НЕ МАГУ НЕ ЗГАДЗІЦЦА з Н. К. у адным: «бурная дзейнасць, накіраваная ў нікуды» сапраўды нікому не патрэбна. Больш таго, яна небяспечна. Нядбайныя актывісты, якія ствараюць ілюзію дзелавітасці, не задумваюцца аб неабходнасці і карысці сваёй працы. Але калі яны проста не думаюць аб гэтым, дык іншыя, тыя, хто яшчэ не стаў на актыўную жыццёвую пазіцыю, выказваюць недавер і сумненне ў неабходнасці грамадскай работы наогул.

Сапраўдны актывіст у першую чаргу клапоціцца аб тых, хто вучыцца і жыве побач. Нездарма кажуць, што чалавек адчувае сябе шчаслівым толькі тады, калі шчаслівыя акружаючыя яго людзі. А за шчасце трэба змагацца, лісты ў газету тут не дапамогуць.

У нас ёсць шмат цудоўных, добрых традыцый. Але, на жаль, сустракаецца яшчэ фармальны падыход да іх, калі не улічваюцца асаблівасці студэнцкай аўдыторыі, час правядзення, ступень занятасці. А гэта вельмі важна. Хачу звярнуцца да камсамольскіх важакоў: каб не было такіх вось пісьмаў (і не толькі пісьмаў, але і размоў), трэба вельмі старанна прадумваць усе мерапрыемствы, вывучаць водгукі студэнтаў пасля іх правядзення, абавязкова улічваць пажаданні і заўвагі. Толькі ў гэтым выпадку мы можам разлічваць на памяншэнне колькасці людзей, якія не бачаць неабходнасці ў грамадскай рабоце. Яны проста не змогуць заставацца ў баку ад яе.

**І. ДАЛГОВА,**
**студэнтка механіка-матэматычнага факультэта.**

## «Спытай сябе»

«Я — ЗА СВАБОДНЫ ВЫБАР...» Хачу адзначыць, што я таксама, як і Н. К., за свабодны выбар сваёй жыццёвай пазіцыі. Людзі самі павінны ставіць перад сабой мэты і здзяйсняць іх. І я не хачу, каб мяне прымушалі рабіць тое, чаму я не веру, да чаго не адчуваю ніякага прызвання, таму я свядома накіроўваю і арганізую кола сваіх інтарэсаў такім чынам, каб было цікава жыць. Прыклады? Калі ласка: я паступіў вучыцца на факультэт журналістыкі (дарэчы, паступаў тройчы), таму што лічу працу журналіста цікавай. І адказнай. У вольны час займаюся грэбляй, працую трэнерам на грамадскіх пачатках, для мяне гэта цікава. Ды і трэнераў пакуль што не хапае. На факультэце працую адным з рэдактараў насценнай газеты. Справа таксама цікавая. І патрэбная.

«Не рвусь я грудью в капитаны»... Што праўда, то праўда. Ён не рвецца, а хутчэй за ўсё адарваўся ад усіх, адгарадзіўся ад таварышаў непрынцыповай філасофіяй сузіральніка, нацэліўшы сябе на заглытванне ведаў, або, прасцей кажучы, на дыплом. Дарэчы, незразумела, чаму Н. К. так цвёрда перакананы ў тым, што ВНУ павінна даваць толькі веды? Бадай, не будзе спрэчным тое, што веды, нават выдатныя, самі па сабе яшчэ не гарантуюць чалавеку высокасумленных паводзін, не забяспечваюць яго маральных якасцей. Больш таго, голыя веды часам ператвараюцца ў форму абразлівай зняватгі да навакольных, беспадстаўнай задаволенасці сабой. Грош цана ведам, калі яны не падмацоўваюцца практыкай, не становяцца сапраўднай часткай агульнай культуры, не з'яўляюцца пераканаынем.

Хто ён, гэты Н. К.? Пачынаючы дэмагог? Актыўны песіміст? А можа, проста звычайны паклёпнік? Памятаеце, «я лічу іх (камсамольскіх лідэраў) людзьмі няшчырымі»? Безумоўна, і на камсамольскай рабоце можна сустрэць безыніцыятыўных фармалістаў, якія толькі і здольны, што схавацца ў «папяровую завіруху». Такое, на жаль, здараецца, але аўтар мянушку «няшчырыя» падараваў усяму камсамольскаму актыву. Гэта і ёсць тое, што называецца паклёпам. Наогул «праграма пазіцыі» пакідае дзіўнае ўражанне: з аднаго боку, аўтар паўстае чалавекам, які імкнецца да вялікай справы, а з другога — адчуваецца, што сам ён і пальцам не варухне, каб нешта побач з сабой удасканаліць.

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

## «А табе спакойна»

ПАВАЖАНЫ Н. К.! З падвоенай увагай чытаў я твой ліст у газету, таму што некалі сам меркаваў такім чынам і таму, што цяпер думаю інакш.

Паслухай, ты адукаваны чалавек. Гэта бясспрэчна, тым больш, што ад вучобы ты не ўхіляешся, як сам гаворыш. Значыць, ведаеш, што назоўнік «грамадства» і прыметнік «грамадскі» маюць адну аснову. І не толькі граматычную. Няўжо ты, вывучаючы універсітэцкія навукі, у тым ліку і грамадскія, не ведаеш, што ў нас у краіне людзей у значнай меры аб'ядноўваюць грамадскія сувязі? І ці не здаецца табе, што дзякуючы сваёй пазіцыі ты ўрэшце застанешся ў баку ад грамадства, якім бы выдатным спецыялістам ты ні быў. А ў гэтым выпадку табе пагражае тое, чаго маладосць не любіць, — мяшчанства.

Я згодзен з табой наконт «папяровай завірухі», фармалізму і нуды, якія пануюць у пэўных студэнцкіх групах. Але чаму тваё высакароднае абурэнне ананімнае, а абвінавачванні агульныя? Калі цябе, як і мяне, хвалююць нашы недахопы, чаму ты не прыйдзеш у камітэт камсамола, у прафбюро, і не проста каб паскардзіцца, а з нейкай прапановай, добрай парадай? Канешне, можа здарыцца, што наб'еш сабе гузакоў, пакуль будзеш змагацца за праўду, але мне здаецца, ты абвінавачваеш толькі для таго, каб прыкрыць уласную інфантыльнасць.

Ты лічыш, што камсамолу, акрамя ўзносаў, ад цябе нічога не патрэбна. Здаецца, ты наогул не адчуваеш сябе патрэбным людзям. Але калі ты сам не жадаеш і пальцам варухнуць, ніхто не прыбяжыць да цябе і не скажа: «Дапамажы!». Табе навязваюць «несур'ёзныя» мерапрыемствы? А як наконт таго, каб паспрачацца, павяваць, нарэшце, прапанаваць тое, што ты лічыш сур'ёзным? Ці не аб гэтым вы часам шкадуеце у сваёй кампаніі? Але... нервовыя клеткі не аднаўляюцца, часу не хапае, ды і навошта парушаць спакойнае жыццё...

Табе цёпла і ўтульна. Ты пагарджаеш кар'ерыстамі, смяешся над упартымі адзіночкамі, якія, між іншым, чакаюць не дачакаюцца дапамогі ад такіх жа, як ты. А табе спакойна.

«Я — за свабодны выбар сваёй жыццёвай пазіцыі». Ніхто і не загадвае табе думаць толькі так і не інакш. Сваю жыццёвую пазіцыю ты, як і кожны з нас, выбераш сабе сам, толькі памятай, што ты — чалавек дарослы, грамадзянін сваёй краіны і, спадзяюся, яе патрыёт. А краіне патрэбны маладыя, разумныя, сумленныя і гарачыя сэрцы, якія здольны адстаяць нашы ідэалы ў любой барацьбе, а таксама і ў ідэалагічнай. Вось навошта гэта табе, мне і ўсім нам!

**І. АРЛОЎ.**

## «Стану такім жа»

У ЦЭЛЫМ Я ЗГОДЗЕН з думкай Н. К. Навошта мне грамадская работа? Толькі нервы сапсуеш. Не, не падумайце, калі ласка, што я нічым не займаюся. Кожны год мяне выбіраюць у кіруючыя органы факультэта. Стараюся апраўдаць давер таварышаў і вельмі задаволены, калі бачу добрыя вынікі сваёй працы.

Але што я маю? Па-першае, вядомасць не толькі на факультэце, а і ў пэўных колах універсітэта. Па-другое, мяне ўзнагароджвалі граматамі, маю падзякі.

Чаго не маю? Не маю вольнага часу, не магу нават спакойна адпачыць, вучыцца цяжкавата. Цяпер спатыкнуўся ў час сесіі і гадаў: ці будзе стыпендыя? Сорак рублёў мне вельмі патрэбны.

А што мае Н. К.? Усё, што трэба. Ён цікава праводзіць вольны час, якога ў яго шмат, спакойна рыхтуецца да экзаменаў і без напружанасці здае іх. І самае галоўнае — ён не псуе нервы. Ніколі.

Не памыляецца той, хто нічога не робіць. Мне ж даводзіцца па некалькі разоў у дзень выслухоўваць розныя павучанні, крытыку і г. д. Папрацуюць людзі так з год і адыходзяць ад грамадскага жыцця. На змену ім прыходзяць тыя, каму патрэбны льготы ці кар'ера. Яны ствараюць для гэтага бачнасць работы, і не больш. Вось адкуль нецікавасць нашага студэнцкага жыцця, пра якую так шмат гавораць. Такія людзі — тыя ж самыя Н. К., толькі ў другім выглядзе.

Гавораць, што трэба весці барацьбу супраць «ціхіх», такіх, як Н. К. Нічога не выйдзе. Упэўнены, як кажуць, на сто працэнтаў. Перш чым такое рабіць, трэба прагледзець свае рады. Трэба падабраць у камсамольскія, прафсаюзныя, іншыя грамадскія арганізацыі такіх студэнтаў, якія б з душой працавалі, каб для іх такая дзейнасць была радасцю, стварыць для іх працы пэўныя ўмовы. Тады можна будзе гаварыць пра барацьбу з Н. К.

А так я згодзен з ім. Мабыць, у наступным навучальным годзе я зраблюся такім жа, як і ён, хоць і не хочацца.

**А. В.,**
**студэнт.**

# НА КРЫЛАХ СПАБОРНІЦТВА

**Адбыўся сход прафсаюзнага актыву БДУ імя У. І. Леніна, які падвёў вынікі сацыялістычнага спаборніцтва за 1982 год і прыняў сацыялістычныя абавязацельствы калектыву універсітэта на 1983 год.**

**На сходзе прафсаюзнага актыву прысутнічалі члены прафсаюзнага камітэта універсітэта, прафсаюзных бюро факультэтаў і падраздзяленняў, прафгрупоргі, члены рэктарата, парткома і сакратары партыйных бюро факультэтаў.**

**З дакладам выступіў старшыня прафсаюзнага камітэта БДУ імя У. І. Леніна, дэлегат XVII з'езда прафсаюзаў СССР Э. В. Шастаковіч. У спрэчках выступілі дырэктар НДІ ФХП В. В. Свірыдаў, старшыня прафбюро кафедр грамадскіх навук А. І. Мішук, загадчык кафедры матэматычнага забеспячэння АСК М. А. Ляпшынскі, старшыня прафбюро СКТБ з доследнай вытворчасцю Г. М. Пармон, сакратар партбюро фізічнага факультэта Л. М. Баркоўскі, старшыня прафбюро выдавецтва БДУ і друкарні В. Р. Рудзь, старшыня камісіі аховы працы і тэхнікі бяспекі прафсаюзнага камітэта П. М. Гапонік.**

У СВАІМ ДАКЛАДЗЕ старшыня прафсаюзнага камітэта Э. В. Шастаковіч адзначыў, што калектыў універсітэта, ажыццяўляючы гістарычныя рашэнні XXVI з'езда КПСС, паспяхова выканаў прынятыя сацыялістычныя абавязацельствы па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, асветы, навукі і культуры, у развіцці і павышэнні эфектыўнасці навуковых даследаванняў, прысвяціўшы іх знамянальнай падзеі ў жыцці савецкага народа — 60-годдзю ўтварэння СССР.

Ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве ў азнаменаванне 60-й гадавіны СССР пераможцамі прызнаны калектывы СКТБ з доследнай вытворчасцю і выдавецтва Белдзяржуніверсітэта, якія ўзнагароджаны пераходнымі Чырвонымі сцягамі мінВНУ СССР і ЦК галіновага прафсаюза.

Камсамольская арганізацыя універсітэта ўзнагароджана, як і ў мінулым годзе, пераходным Чырвоным сцягам ЦК ЛКСМ Беларусі за першае месца сярод навучальных устаноў рэспублікі па выніках трэцяга працоўнага семестра.

Падводзячы вынікі сацыялістычнага спаборніцтва за 1982 год, сказаў дакладчык, неабходна заўважыць, што універсітэт перавыканаў план выпуску спецыялістаў па ўсіх формах навучання. На дзённым аддзяленні дыпломы спецыялістаў атрымалі 1826 чалавек, з якіх 689 былі накіраваны на работу ў сельскія мясцовасці рэспублікі. Акрамя таго, 343 чалавекі з сельскай мясцовасці атрымалі універсітэцкую адукацыю на завочнай форме навучання.

Аб павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў сведчыць наступнае: 11,6 працэнта выпускнікоў дзённай формы (212 чалавек) атрымалі дыплом з адзнакай (у 1981 годзе — каля 9 працэнтаў). Па вячэрняй форме навучання адпаведна 2,6 і 1,4 працэнтаў. Тэматыка дыпломных работ усё цясней звязваецца з рашэннем важнейшых вытворчых задач і навуковых праблем: 36,6 працэнта з агульнай колькасці дыпломных работ рэкамендаваны да ўкаранення (у 1981 годзе— 26,6). Так, напрыклад, па выніках дыпломнай работы студэнта фізічнага факультэта А. Сазонава ў друк накіраваны два артыкулы.

Вялікіх поспехаў дасягнулі вучоныя універсітэта, работа якіх была накіравана на расшырэнне фундаментальных даследаванняў і рашэнне шэрагу актуальных задач прыкладнога характару, пастаўленых перад савецкай навукай XXVI з'ездам КПСС, майскім і лістападаўскім (1982 г.) Пленумамі ЦК КПСС. Зараз ва універсітэце вядуцца работы па 14 тэмах, звязаных з рэалізацыяй Харчовай праграмы.

У 1982 годзе было ўкаранёна ў вытворчасць 114 і ў вучэбны працэс 40 навукова-даследчых работ. Эканамічны эфект ад укаранення склаў 22,4 мільёна рублёў. Атрымана 197 станоўчых рашэнняў на выдачу аўтарскіх пасведчанняў.

Супрацоўнікі універсітэта ўдзельнічалі ў рабоце 300 міжнародных, усесаюзных і рэспубліканскіх канферэнцый, сімпозіумаў, семінараў.

За мінулы год выдадзены 222 работы, у тым ліку 61 манаграфія, 115 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, 22 зборнікі навуковых прац і 24 брашуры.

Універсітэт супрацоўнічаў з 6 ВНУ сацыялістычных краін, з якімі праводзіў сумесныя даследаванні па 35 тэмах.

За год абаронена 5 доктарскіх і 116 кандыдацкіх дысертацый.

У выкананні тэматычнага плана навукова-даследчай работы універсітэта ўдзельнічала 1846 студэнтаў. Па выніках НДР надрукавана 257 артыкулаў і дакладаў у матэрыялах канферэнцый, з'ездаў, сімпозіумаў, ва усесаюзных і рэспубліканскіх часопісах. Сталі сааўтарамі вынаходніцтваў 24 студэнты.

Разам з тым, як адзначыў дакладчык, навукова-даследчыя падраздзяленні павінна насцеражыць тэндэнцыя памяншэння колькасці работ, укаранёных у вытворчасць. У параўнанні з 1981 годам эканамічны эфект ад укаранення дасягненняў навуковых даследаванняў паменшыўся на 1 мільён 200 тысяч рублёў.

Неабходна яшчэ раз уважліва прааналізаваць нашы магчымасці і зрабіць усё неабходнае, каб палепшыць падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Мала яшчэ ва універсітэце абараняецца доктарскіх дысертацый. Застаецца нізкім працэнт абароны дысертацый у тэрмін. На факультэце радыёфізікі і электронікі, хімічным, біялагічным, гістарычным, кафедрах педагогікі, палітычнай эканоміі гуманітарных факультэтаў, у НДІ ПФП і ФХП, а таксама ў іншых падраздзяленнях не выконваюцца абавязацельствы па абароне дысертацый.

Далей таварыш Э. В. Шастаковіч адзначыў, што задача сходу прафсаюзнага актыву не толькі ў тым, каб падвесці вынікі спаборніцтва, але і разгледзець тыя праблемы арганізацыі яго, вырашэнне якіх у многім прадвызначае паспяховае выкананне студэнтамі, выкладчыкамі, вучонымі, рабочымі і служачымі універсітэта сацыялістычных абавязацельстваў трэцяга года адзінаццатай пяцігодкі.

Так, напрыклад, пры падвядзенні вынікаў міжфакультэцкага спаборніцтва па вучэбна-метадычнай рабоце не ўлічаны вынікі выкарыстання тэхнічных сродкаў навучання.

У чым жа справа? А справа ў тым, што ў саміх умовах спаборніцтва першы паказчык — «наяўнасць сродкаў»—нічога не можа сказаць аб іх выкарыстанні, а даныя па другому паказчыку—«выкарыстанне тэхнічных сродкаў у вучэбным працэсе»—падаюць: па факультэтах — кабінет ТСН БДУ, па кафедрах — метадычныя камісіі факультэтаў. Але гэтых рэзультатаў і не магло быць, таму што да цяперашняга часу няма «Палажэння аб конкурсе на лепшае прымяненне тэхнічных сродкаў навучання ў вучэбным працэсе». А рашэнне савета універсітэта па гэтаму пытанню прынята больш чым год назад. Названы і канкрэтныя выканаўцы — вытворча-масавая камісія прафсаюзнага камітэта, вучэбна-метадычны цэнтр і вучэбны аддзел.

Такім чынам, першая праблема ў арганізацыі спаборніцтва — выкананне, дысцыпліна саміх арганізатараў сацыялістычнага спаборніцтва. Другая, не менш важная, — аператыўнае вывучэнне перадавога вопыту. Вось, напрыклад, на фізічным факультэце ўжо 2 гады дзейнічае «Палажэнне аб конкурсе на лепшую вучэбную лабараторыю». Гэта дазволіла факультэту не толькі аблегчыць падвядзенне вынікаў па прымяненню ТСН, але і стымулявала кафедры да ўдасканалення вучэбнага працэсу. За два гады колькасць прэтэндэнтаў на прызавыя месцы ў гэтым конкурсе падвоілася.

А ва універсітэце такіх лабараторый 40. Магчыма, гэты вопыт дапаможа вырашыць і праблему арганізацыі спаборніцтва сярод вучэбна-дапаможнага персаналу. Заўважым, што на факультэтах іх працуе 575 чалавек, а практычна яны не могуць адчуць і ўбачыць вынікі свайго ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве, таму што яно не арганізавана ў маштабах універсітэта.

Выклікае здзіўленне і тое, што дагавораў аб спаборніцтве паміж НДІ няма, як не існуе іх і паміж факультэтамі і кафедрамі. Неабходна распрацаваць палажэнне аб спаборніцтве на званне лепшай навукова-даследчай лабараторыі. У ім, акрамя 28 лабараторый інстытутаў, могуць прыняць удзел 3 праблемныя і 8 галіновых лабараторый навукова-даследчай часткі універсітэта.

У гэтых прыкладах яскрава бачны памылкі вытворча-масавай камісіі прафсаюзнага камітэта. Не ў меншай ступені віна і агульнауніверсітэцкай камісіі па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Такім чынам, чарговы і вельмі сур'ёзны недахоп усёй арганізацыйнай работы па сацыялістычнаму спаборніцтву — адсутнасць асабістай ініцыятывы ў пошуках найбольш эфектыўных калектыўных і індывідуальных форм спаборніцтва.

У сацыялістычным спаборніцтве неабходна шырэй практыкаваць сістэму конкурсаў. У СКТБ з доследнай вытворчасцю і Вылічальным цэнтры назапашаны цікавы вопыт па арганізацыі конкурсаў «Лепшы па прафесіі», прычым не толькі па асноўных рабочых прафесіях, але і сярод інжынерна-тэхнічных работнікаў. Напрыклад, «Лепшы канструктар», «Лепшы тэхнолаг». Гэта адна з цікавых форм індывідуальнага спаборніцтва, якую неабходна развіваць, распаўсюджваць і праводзіць не толькі ў падраздзяленнях, але і ажыццяўляць на ўзроўні універсітэта. Гэтыя конкурсы маюць вялікае выхаваўчае значэнне, узмацняюць адказнасць кіраўнікоў за стварэнне неабходных умоў для работы.

Выступаючы адзначыў, што далейшае фарміраванне адзінай сістэмы індывідуальных і калектыўных форм спаборніцтва немагчыма без новага палажэння аб арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ва універсітэце. Ранейшае палажэнне, выдадзенае ў 1977 годзе і дапоўненае ў 1979 сістэмай паказчыкаў міжфакультэцкага саперніцтва, ужо не адпавядае дасягнутаму ўзроўню унутрыуніверсітэцкага спаборніцтва.

У заключэнне таварыш Шастаковіч сказаў, што, выконваючы гістарычныя рашэнні XXVI з'езда КПСС, майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, рашэнні XXIX з'езда КПБ, калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна прыкладзе ўсе свае сілы, веды і вопыт да дасягнення яшчэ больш высокіх паказчыкаў у сацыялістычным спаборніцтве.

# САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

## БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА НА 1983 ГОД

Прымаючы ўдзел ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве, калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна бярэ на сябе наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:

1. Выканаць план прыёму і план выпуску спецыялістаў па ўсіх формах навучання.

2. Абараніць 5 доктарскіх і не менш за 90 кандыдацкіх дысертацый супрацоўнікамі і аспірантамі універсітэта.

3. Падрыхтаваць да друку і выдаць не менш за 15 вучэбнікаў і вучэбных дапаможнікаў і 130 метадычных распрацовак.

4. Падрыхтаваць да друку і выдаць не менш як 450 дакладаў на навуковыя канферэнцыі.

5. Давесці да 37 працэнтаў колькасць дыпломных работ, рэкамендаваных да ўкаранення.

6. Прадставіць на Усесаюзны і Рэспубліканскі конкурсы не менш як 280 студэнцкіх навуковых работ.

7. Падрыхтаваць не менш як 180 артыкулаў у сааўтарстве са студэнтамі.

8. Атрымаць не менш як 65 працэнтаў станоўчых рашэнняў па заяўках на вынаходніцтвы.

9. Атрымаць эканамічны эфект ад укаранення закончаных навукова-даследчых работ не менш як 15 мільёнаў рублёў.

10. Працягваць работы па 14 тэмах, звязаных з рэалізацыяй Харчовай праграмы СССР. Выканаць работ на агульную суму 1,5 мільёна рублёў.

11. Сфарміраваць зводны студэнцкі будаўнічы атрад колькасцю не менш як 2000 чалавек.

12. Прачытаць перад насельніцтвам не менш як 8700 лекцый.

13. Правесці 30 паходаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа, прыцягнуць да ўдзелу ў іх 800 студэнтаў.

14. Асвоіць студэнцкімі будаўнічымі атрадамі 5 млн. рублёў капіталаўкладанняў.

15. Падрыхтаваць майстроў спорту СССР і кандыдатаў у майстры — 30 чалавек, спартсменаў І разраду — 90 чалавек, спартсменаў масавых разрадаў — 4700 чалавек, значкістаў ГПА — 2200 чалавек.

16. Выканаць наменклатурных мерапрыемстваў па ахове працы і тэхніцы бяспекі на 22 тысячы рублёў.

17. Выпрацаваць сіламі супрацоўнікаў і студэнтаў не менш як 100 тысяч чалавекадзён у калгасах і саўгасах рэспублікі, у тым ліку і ў падшэфным саўгасе «Гарадок».

18. Сэканоміць 110 тысяч кілават-гадзін электраэнергіі.

**Сацыялістычныя абавязацельствы абмеркаваны і аднадушна прыняты на сходзе прафсаюзнага актыву Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна 11 лютага 1983 года.**

# ЗВОДНАЯ ТАБЛІЦА РАЗМЕРКАВАННЯ МЕСЦ ПА ВЫНІКАХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ФАКУЛЬТЭТАЎ У 1982 ГОДЗЕ

| | I | II | III | IV | V | VI |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Фізічны | 5 | 1 | 2 | 3 | 5 | 1 |
| Радыёфізікі і электронікі | 10 | 3 | 3 | 2 | 6 | — |
| Хімічны | 11 | 4 | 1 | 4 | 9 | 5 |
| Механіка-матэматычны | 7 | 6 | 6 | 8 | 1 | 3 |
| Прыкладной матэматыкі | 2 | 7 | 5 | 6—7 | 4 | 2 |
| Біялагічны | 8 | 2 | 11 | 1 | 10 | 7 |
| Геаграфічны | 9 | 9—10 | 8 | 5 | 11 | 10 |
| Гістарычны | 4 | 5 | 10 | 6—7 | 3 | 4 |
| Журналістыкі | 3 | 8 | 7 | 9 | 8 | 8 |
| Юрыдычны | 6 | 11 | 9 | 11 | 2 | 9 |
| Філалагічны | 1 | 9—10 | 4 | 10 | 7 | 6 |

I — кадры, павышэнне кваліфікацыі
II — навукова-даследчая работа
III — навукова-метадычная работа
IV — навукова даследчая работа студэнтаў
V — грамадска-палітычная і арганізацыйна-масавая работа
VI — агульнае месца.

СТУДЭНТ І НАВУКА

# Галоўная рыса

ГУРТОК «Старажытны свет і сучаснасць» быў створаны на гістарычным факультэце даўно, але канчаткова сфарміраваўся толькі ў 1978 годзе. З гэтага года і пачынаецца яго летапіс. У 80-я гады гуртон перажыў сваё другое нараджэнне. Новыя члены яго — энергічныя і дапытлівыя. «Ветэраны»-трэцякурснікі і першакурснікі стварылі актыў, ядро гуртка.

Арганізацыя работы стала цяпер іх справай, а не толькі клопатам кіраўніка. Па прапанове Ірыны Левінай арганізавалі кансультацыйнае бюро ў дапамогу першакурснікам, якія пішуць курсавыя работы.

Зацікаўленасць — галоўны стымул актыўнасці студэнтаў. Некаторыя прыходзяць у гурток толькі з-за курсавых. Іншыя ж, а іх большасць, прыходзяць, каб працаваць. У іх жыцці гурток займае важнае месца. Тут яны не толькі пачалі сваю навукова-даследчую работу, але і знайшлі сяброў-аднадумцаў. А Ірына Левіна, Ганна Смольская, Марына Цемчык і пасля заканчэння універсітэта засталіся яго членамі.

Членаў гуртка «Старажытны свет і сучаснасць» вызначае нястомнасць у пошуках новага. Імкнучыся да паглыбленасці ў прадмет, яны вырашылі ўзяць адзін напрамак у навукова-даследчай рабоце. І выбралі міфалогію. Гэта эксперымент. А пакуль студэнты рыхтуюць даклады да заняткаў па міфалогіі на тэму «Антычная міфалогія ў рускім жывапісе» і іншыя.

Займаюцца ў гуртку не толькі студэнты-гісторыкі, а і філосафы, палітэканомы, прыцягвае ён і студэнтаў вячэрняга аддзялення. Госці таксама могуць выступіць са сваімі дакладамі.

Работа навуковага гуртка не абмяжоўваецца рамкамі універсітэта. У лістападзе 1981 года Ірына Зуй і Аляксандра Верашчагіна (іх работы прызнаны лепшымі) былі запрошаны ў Казань на студэнцкую навукова-практычную канферэнцыю, а ў красавіку 1982 года яны выступілі на навуковай канферэнцыі ў Сімферопалі. У сваю чаргу, гурткоўцы прымалі ў сябе студэнтаў з Харкава, Казані, Вільнюса.

Звязаны гурток і са школьнікамі. Кафедра вядзе ў 41-й мінскай школе факультатыўны курс для вучняў старэйшых класаў па гісторыі Старажытнага свету.

У планах гуртка — падрыхтоўка міжрэспубліканскай канферэнцыі, а таксама выпуск альманаха па міфалогіі. І яны свае планы ажыццёвяць, таму што ёсць адна, напэўна, галоўная рыса ў удзельнікаў гуртка «Старажытны свет і сучаснасць»: у іх слова ніколі не разыходзіцца са справай.

**А. ЗЯНКЕВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



*Зімовы вечар.*

*Фотаэцюд А. ВАЛОШЫНА.*

*У ЧАС зімовых канікулаў у розныя куткі Беларусі накіраваліся студэнты і выкладчыкі універсітэта — удзельнікі «зорнага» паходу па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа, прысвечанага 40-годдзю Сталінградскай бітвы і 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.*

*Сёння аб пройдзеных шляхах, аб убачаным і зробленым расказваюць самі удзельнікі паходу.*

# Паход у гісторыю

«ЗОРНЫЯ» ПАХОДЫ. Колькі сэнсу ў гэтых словах! Маладосці лёгка адчуць рух, пра які так цудоўна сказаў Максім Багдановіч:

**«...Хто мы такія!**
**Толькі падарожныя,—**
**папутнікі сярод нябёс.**
**Нашто ж на зямлі**
**Сваркі і звадкі, боль і горыч,**
**Калі ўсе мы разам ляцім**
**Да зор!»**

Назаўсёды светлыя для нас зорачкі на пілотках салдат і зоркі над магіламі загінуўшых байцоў Вялікай Айчыннай.

Не забываем мы і тыя зорныя часіны нашай гісторыі, сведак якіх ужо не засталося.

Здаецца, мы людзі, далёкія ад усялякай лірыкі. Мы — студэнты фізфака і мехмата. На зімовых канікулах вырашылі пайсці ў падарожжа па Беларусі, толькі ніяк не маглі вырашыць — куды? Раптам адзін з нас сказаў:

— А сёлета ж спаўняецца сто дваццаць год з часу славутага паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага.

Усе пагадзіліся — шлях наш павінен пралегчы па Ашмянскаму і Астравецкаму раёнах. Іменна тут, на Гродзеншчыне, паўстанне набыло найбольшы размах.

Акрамя таго, мясціны гэтыя звязаны яшчэ з адным імем, дарагім кожнаму ўраджэнцу Беларусі. У Жупранах (Ашмянскі раён) пахаваны Францішак Багушэвіч. Як сведчаць нядаўна адшуканыя дакументы, паэт не толькі словам заклікаў суайчынніка, «каб за край быў умерці гатоў», але і сам меў дачыненне да паўстання 1863 года.

У гады Вялікай Айчыннай вайны нашчадкі паўстанцаў стваралі тут шматлікія партызанскія атрады. А акупанты — шматлікія лагеры.

Адам Мальдзіс, які сам родам з гэтых мясцін, пісаў у кнізе «Астравеччына, край дарагі...»: «У Гудагай завезлі чалавек з трыста. Набілі ў школу, а каторыя начавалі пад голым небам. Акружылі школу калючым дротам, будкі паставілі з кулямётамі... З трохсот чалавек к канцу засталося семдзесят, і тых некуды вывезлі».

Сам Гудагай не на кожнай карце адшукаеш. Але мы пераканаsuccessfully, што чалавек павінен вывучаць гісторыю не толькі па падручніках і картах, але і вось так, адмяраючы сваімі нагамі крокі Каліноўскага, Багушэвіча і тых трохсот невядомых людзей. Прайсці іх дарогамі, падыхаць іх паветрам...

І нас не палохалі складанасці накшталт непагадзі і цяжкіх рукзакоў. У абмен на стому мы атрымалі неацэнную каштоўнасць: дакрануліся да гісторыі, да лёсу роднай зямлі.

**І. МІКЛАШЭВІЧ,**
**кіраўнік паходу, студэнт 3-га курса фізічнага факультэта.**

# «...Не толькі імгненні на здымку»

НІ НЕЧАКАНАЯ АДЛІГА, ні цяжкасці нядаўняй сесіі не спынілі студэнтаў і супрацоўнікаў механіка-матэматычнага факультэта—удзельнікаў «Зорнага». 6 лютага мы развіталіся са сталіцай, кінулі выклік цяжкасцям паходнага жыцця...

Лепель — Полацк — два пункты на карце. Для нас яны, гаворачы на родным мехматаўскім дыялекце, нашы каардынаты ў прасторы. Трэба сказаць, што, пачынаючы з Лепельскай, ва ўсіх школах — нашых арыенцірах — сустракалі мы цёплы, шчыры прыём. Напэўна, кожнаму патрэбна калі-небудзь выпрабаваць сябе дарогай, толькі тады можна ацаніць усё, што дае яна чалавеку. Ацаніць стомай, перамогай над сабой. «Адлегласці» дапамаглі зразумець гэтыя вось пройдзеныя кімсьці кіламетры. Вядома, мы не толькі «пакаралі» дарогу, былі і лекцыі, і канцэрты. Сцвярджаць, што моладзь, якая слухала нас, пойдзе толькі на мехмат БДУ, будзе не зусім пераканаўча, але тое, што многія нарэшце зразумеюць, паступаць ім у ВНУ ці не, у гэтым упэўненасць ёсць.

Уразіла мноства азёр Лепельшчыны. Міжволі задумваешся, калі бачыш такую прыродную шчодрасць: які ўсё ж дзіўны наш край — Белая Русь. Але галоўнае — людзі. Нас сустракалі з радасцю і здзіўленнем: як здолелі ў такую непагадзь дайсці? А развіталіся, як развітваюцца блізкія людзі.

...Ёсць многа цудоўных песень. А самыя лепшыя з іх увайшлі ў рэпертуар нашых агітканцэртаў, якія былі не проста добрымі — выдатнымі. Апладысменты гледачоў — важкае пацверджанне поспеху.

Шэсць дзён паходу застануцца не толькі імгненнямі на фота, не толькі ўспамінамі, яны будуць першым крокам. Наперадзе тысячы дарог, яшчэ больш — адкрыццяў.

**У. ХАРОШКА,**
**студэнт механіка-матэматычнага факультэта.**

# Шляхамі стагоддзяў

МАРШРУТ НАШАГА ПАДАРОЖЖА пралягаў па цікавых мясцінах Беларусі. Пачатак — у старажытным Нясвіжы, у горадзе, заснаваным яшчэ ў XIII стагоддзі. Мы пазнаёміліся з палацавазамкавым комплексам, які на працягу многіх гадоў з'яўляўся рэзідэнцыяй польскіх магнатаў Радзівілаў. Нават зімой, калі наваколле ўсыпана снегам, калі скаваны лёдам акружаючыя замак азёры, ён пакідае ўражанне велічнасці і непаўторнасці. А мясцовы парк мы наогул не маглі абысці пешшу — такі ён вялізны! І сёння здзіўляе сваёй прыгажосцю фарны касцёл, пабудаваны італьянскім майстрам Янам Марыя Бернардоні ў 1593 годзе па тыпу рымскага храма Іль-Джэзу. Помнікам старажытнасці з'яўляецца і Слуцкая брама, якая была пабудавана ў канцы XVI стагоддзя і абараняла ўезд у горад з боку Слуцкага тракту.

Пасля Нясвіжа наш шлях ляжаў цераз Гарадзею ў Мір. У гэтым невялікім пасёлку мы агледзелі цудоўны замак XVI стагоддзя, невялікую царкву, на франтоне якой захавалася дзіўная ікона. Шкада, што Мірскі замкавы комплекс знаходзіцца сёння ў заняпадзе. Рэстаўрацыя, што пачыналася тут неаднаразова, амаль не вядзецца. Застаецца спадзявацца, што зрушыць справу з мёртвай кропкі дапаможа адкрыццё ў Міры ў наступным годзе мастацкага вучылішча.

Наступным пунктам прыпынку былі Карэлічы — цэнтр аднаго з перадавых раёнаў рэспублікі. І хоць тут няма на сённяшні дзень вядомых помнікаў гісторыі, сам пасёлак уражвае чысцінёй і ўтульнасцю.

Навагрудак, куды мы дабраліся потым, памятае набегі шматлікіх ворагаў. Шмат разоў горад гарэў, разбураўся, але працавітыя жыхары аднаўлялі яго.

Свіцязь... Каму не вядома гэта возера! Сінявокае, яно быццам схавалася ад зайздросных вачэй у гушчары навакольных лясоў. Нават цяпер, узімку, можна сустрэць тут мноства турыстаў. А колькі легенд і паданняў звязаў народ з возерам! Маўклівым волатам застыў на беразе магутны дуб, які пасадзіў Адам Міцкевіч. У кожнага міжволі ўзнікала жаданне пабываць тут летам, паглядзецца разам з векавымі дрэвамі ў люстраную гладзь возера, паслухаць шэпт хваль, удыхнуць поўнымі грудзьмі сасновы водар.

Наш маршрут закончыўся ў Баранавічах — маладым, перспектыўным горадзе. Адсюль імклівая электрычка за тры гадзіны давезла нас у Мінск. Падарожжа не толькі дало нам магчымасць лепш пазнаёміцца з гісторыяй роднага краю, сустрэцца з яго працавітымі людзьмі. Адной з важнейшых задач падарожжа з'яўлялася правядзенне прафарыентацыйнай работы ў сярэдніх школах рэспублікі. На працягу шасцідзённага маршруту прачытана 23 лекцыі. Старшакласнікі пазнаёміліся з умовамі прыёму ва універсітэт у 1983 годзе, атрымалі неабходныя звесткі аб уступных экзаменах, варыянтах пісьмовых работ у мінулым годзе, пагутарылі са студэнтамі аб іх вучобе і адпачынку. Адбыліся вечары-сустрэчы са школьнікамі ў інтэрнатах сярэдняй школы № 3 г. Нясвіжа і Валеўскай сярэдняй школы Навагрудскага раёна.

**А. ШЫБУТ,**
**выкладчык механіка-матэматычнага факультэта, кіраўнік групы.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

24 лютага 1983 г.

Зак. 372. АТ 04107

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЕЎ